**Асамблея Няўрадавых Дэмакратычных Арганізацыяў**
**http://www.belngo.info**

# Асноўныя тэндэнцыі разьвіцьця і існаваньня беларускага трэцяга сэктару ў верасьні-сьнежні 2005 г.

Падзеі апошніх месяцаў характарызаваліся далейшым узмацненьнем ціску з боку рэжыму на структуры незалежнага трэцяга сэктару. Праверка яго на трываласьць з ужыцьцём самых разнастайных мэтадаў не дало дзяржаўным органам патрэбнага выніку. Тады стаўка была зробленая на дэмаралізацыю і запалохваньне грамадзкіх актывістаў праз прыняцьцё адпаведных папраўак у Крымінальны кодэкс. Фактычна, робіцца спроба па недапушчэньні значнага і заўважнага ўдзелу трэцяга сэктару ў будучай палітычнай кампаніі.

## Палітычная кампанія

Барацьба супраць дыктатуры за дэмакратызацыю нашай краіны патрабуе высілкаў усіх складнікаў незалежнага грамадзтва. Бліжэйшая палітычная кампанія — выбары прэзыдэнта Беларусі — дае шанец на зьмену сытуацыі, зь якога нельга не скарыстацца.

“Ёсьць мясцовасьці, дзе акрамя арганізацыяў трэцяга сэктару няма ніякіх партыйных структураў, і НДА давядзецца выконваць там функцыі партыі. Таму быць “чыстым” трэцім сэктарам, як на Захадзе, у нас не атрымліваецца”, — кажа Аляксандар Мілінкевіч, вядомы грамадзкі і палітычны дзяяч, адзіны кандыдат ад дэмакратычных сілаў на будучых прэзыдэнцкіх выбарах.

Найважнейшай падзеяй восені стаўся Кангрэс дэмакратычных сілаў Беларусі, які прайшоў у Менску 1-2 кастрычніка. Ён адбыўся нягледзячы на шматлікія перашкоды, якія чыніліся ўладамі падчас яго падрыхтоўкі. Нямала раённых сходаў па вылучэньні дэлегатаў адбываліся ў лясах і парках — новая зьява ў палітычным жыцьці краіны. І ўсё ж дэлегаты былі абраныя і прыехалі ў Менск. Сотні сябраў НДА ўзялі ўдзел у абраньні адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў. Ужо ў сярэдзіне кастрычніка Міністэрства юстыцыі распачало збор інфармацыі пра іх, праўдападобна, з мэтай рэпрэсіўных захадаў.

Грамадзкія актывісты ўвайшлі ў склад абласных і раённых штабоў адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў, а пасьля афіцыйнага абвяшчэньня даты выбараў, прызначаных на 19 сакавіка, — у ініцыятыўную групу па зборы подпісаў. А шэраг моладзевых палітычных і грамадзкіх арганізацыяў Магілёва яшчэ ў кастрычніку падпісалі мэмарандум, у якім абвесьцілі аб кансалідацыі намаганьняў у справе падтрымкі адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў Аляксандра Мілінкевіча. Прычым, было заяўлена, што ўсе непаразуменьні і канфлікты паміж гэтымі арганізацыямі пакінутыя да лепшых часоў.

Рэспубліканскія моладзевыя аб’яднаньні і рухі плянуюць узяць самы актыўны ўдзел у мабілізацыйнай кампаніі. Праўда, датэрміновае абвяшчэньне выбараў, безумоўна, унясе свае карэктывы ў гэтую працу.

## Перашкоды ў легалізацыі

Пасьля забароны Мін'юстам у верасьні дзейнасьці незарэгістраваных арганізацыяў, ініцыятываў ды пагрозы рэпрэсіяў, чыноўнікі чакалі, што частка зь іх спыніць сваё існаваньне. Аднак пачала назірацца тэндэнцыя, калі некаторыя грамадзкія ініцыятывы ў гэтай сытуацыі праявілі жаданьне легалізавацца. Гэтыя іх захады павінны былі б вітацца Мін'юстам, але на справе атрымлівалася, што грамадзкім актывістам чыніліся перашкоды.

29 кастрычніка ў Менску праходзіў устаноўчы зьезд грамадзянскай ініцыятывы "Партнэрства", які быў спынены супрацоўнікамі праваахоўных органаў, а дзесяткі дэлегатаў затрыманыя. Іх здымалі на відэакамэру, ўзялі адбіткі пальцаў ды тлумачэньні, пасьля чаго адпусьцілі. Арганізатары, якіх абвінавацілі ў правядзеньні несанкцыянаванай акцыі, былі асуджаныя на 15 сутак арышту альбо атрымалі штраф. Такім чынам, улады сарвалі спробу "Партнэрства" легалізаваць сваю дзейнасьць.

У сьнежні менскія гарадзкія ўлады не далі дазволу на правядзеньне ўстаноўчага зьезду грамадзкага аб'яднаньня беларускіх пэнсіянэраў.

Арганізацыйная праца над стварэньнем грамадзкага аб'яднаньня працягвалася зь вясны. Калі ж быў заплянаваны ўстаноўчы зьезд, у сталіцы не знайшлося вольнага памяшканьня для яго правядзеньня.

Улады рабілі ўсё магчымае для зрыву шэрагу значных мерапрыемстваў, якія праводзіліся зарэгістраванымі грамадзкімі аб'яднаньнямі. Асаблівай увагай карысталіся мерапрыемствы моладзевай тэматыкі. Найбольш характэрны прыклад — зрыў у кастрычніку правядзеньня моладзевага форуму. Нягледзячы на канспірацыйныя ўмовы, у якіх арганізоўваўся Радай моладзевых і дзіцячых грамадзкіх аб'яднаньняў Форум, спэцслужбы прыбылі на турбазу пад Горадняй, а таксама перахапілі ў дарозе мікрааўтобусы з 30 удзельнікамі, што ехалі са сталіцы. Старшыня прэзыдыюму Рады Сьвятлана Каралёва назвала гэтыя падзеі "паранояй на дзяржаўным узроўні". Форум моладзевых арганізацыяў рыхтаваўся Радай на працягу 4 месяцаў, на яго былі запрошаныя прадстаўнікі моладзевых арганізацыяў з усёй краіны.

Адначасова назіраецца тэндэнцыя, калі органы юстыцыі нярэдка прапануюць зарэгістраваным грамадзкім аб'яднаньням самаліквідацыю альбо зьмену статусу. Напрыклад, Фонд імя Льва Сапегі, на патрабаваньне Міністэрства юстыцыі, вымушаны быў правесьці ўніфікацыю дзейнасьці арганізацыі. У рэгіёнах па-ранейшаму будуць працаваць яго філіі, але ўжо бяз права юрыдычнай асобы. Увосені Рада Беларускага Хэльсінскага камітэту з-за складанасьцяў з юрыдычнымі адрасамі прыняла рашэньне пра ліквідацыю ўсіх рэгіянальных структураў. Замест іх цяпер будуць працаваць рэгіянальныя прадстаўнікі БХК.

Сёлета Міністэрства юстыцыі вельмі ўважліва адсочвае публікацыі пра дзейнасьць грамадзкіх аб'яднаньняў і ініцыятываў, інтэрвію зь іх лідэрамі ў незалежным друку. Пасьля некалькіх інтэрвію сацыёляга прафэсара Алега Манаева ім спачатку зацікавіўся мінюст, а пасьля была падключаная пракуратура. Нягледзячы на гэта, А. Манаеў зьбіраецца і надалей спрыяць правядзеньню ў Беларусі сацыялягічных апытаньняў. "Мы будзем гэта рабіць любым коштам, да самага канца, пакуль мы жывыя. І ўрэшце наша краіна будзе такой, якой мы яе хочам бачыць", — кажа ён (Наша ніва, 9 сьнежня 2005 г.).

А вось ініцыятыва групы дзеячоў на чале з генэралам В. Фраловым па зборы подпісаў для правядзеньня рэспубліканскага рэфэрэндуму была паралізаваная Мін'юстам. 26 кастрычніка міністар юстыцыі В. Галаванаў разаслаў ва ўправы юстыцыі ліст, якім забаранялася натарыюсам сьведчыць сапраўднасьць подпісаў асобаў з ініцыятыўнай групы па правядзеньні рэфэрэндуму.

Варта адзначыць, што 29 кастрычніка набыў правамоцнасьць закон "Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб грамадзкіх аб"яднаньнях" (№ 36-З ад 19 ліпеня 2005 г.).

Паводле яго грамадзкія аб’яднаньні, якія былі зарэгістраваныя да гэтага часу, павінны на працягу году прывесьці свае статуты ў адпаведнасьць з новым законам. Цяпер грамадзкія аб’яднаньні будуць вымушаныя ня толькі штогод падаваць у рэгіструючы орган інфармацыю аб сваёй дзейнасьці, але і ня менш, як за 7 дзён інфармаваць яго аб заплянаваным паседжаньні свайго кіроўнага органу.

## Стварэньне дзяржаўных псэўдаграмадзкіх аб’яднаньняў

Курс на стварэньне “дзяржаўна-грамадзкіх аб”яднаньняў”, узяты на ўзбраеньне рэжымам, паступова, але няўхільна зьдзяйсьняецца. Прычым новых структураў зьяўляецца няшмат, пад поўны кантроль дзяржавы пераходзяць ужо існыя буйныя грамадзкія аб’яднаньні. Сярод іх ёсьць і палітызаваныя структуры, і апалітычныя. Напрыклад, на працягу апошняга году пад жорсткі прэс улады патрапіў Саюз паляўнічых і рыбаловаў, які аб’ядноўвае дзесяткі тысячаў чалавек. Праблемай гэтай арганізацыі стала тое, што яе сябры легальна маюць зброю, а значыць, па лёгіцы чыноўнікаў, патэнцыйна ўяўляюць пэўную небясьпеку. Сёлета спэцслужбамі была пасьпяхова рэалізаваная акцыя па захопу пад свой кантроль Саюзу палякаў на Беларусі, які меў разгалінаваныя структуры.

У кастрычніку было канчаткова “зачышчанае” ад іншадумцаў кіраўніцтва спартовых грамадзкіх аб’яднаньняў. Гэта здарылася пасьля нарады, якую праводзіў Аляксандар Лукашэнка са старшынямі спартовых фэдэрацыяў. У выніку, сваіх пасадаў былі пазбаўленыя кіраўнікі фэдэрацыі фрыстайлу (былы рэктар БДУ Аляксандар Казулін) і канькабежнага спорту (славуты спартовец Ігар Жалязоўскі). Цяпер спартовыя грамадзкія аб’яднаньні ачольваюць амаль выключна міністры і чыноўнікі меншага рангу.

У выпадку, калі грамадзкае аб’яднаньне нельга захапіць з дапамогай “пятай калёны” ў яго шэрагах, выкарыстоўваюцца іншыя мэтады. Напрыклад, ствараюцца “клоны” амаль пад такімі самымі назвамі. Найбольш яскравы прыклад — гэта сытуацыя вакол Саюзу беларускіх пісьменьнікаў. У лістападзе адбыўся ўстаноўчы сход праўладнага Саюзу пісьменьнікаў Беларусі, на які з рэгіёнаў былі дастаўленыя дэлегаты. Яго кіраўніком стаў “сэнатар” Мікалай Чаргінец. Варта зьвярнуць увагу на назву новай грамадзкай арганізацыі, бо ўжываньне ў такіх сытуацыях слова “Беларусь” забаронена заканадаўствам. Але, няма сумненьняў, для “свайго” саюзу ўлада зробіць выключэньне. Існаваньне паралельна двух пісьменьніцкіх арганізацыяў наўрад ці працягнецца доўга. Яшчэ ў верасьні мінюст папярэдзіў СБП пра магчымасьць яго ліквідацыі. Пазбаўленьне рэгістрацыі незалежнага пісьменьніцкага саюзу, на думку чыноўнікаў, зможа паспрыяць пераходу ў шэрагі праўладнага СПБ большай колькасьці пісьменьнікаў.

“Паліттэхнолягі ад улады вырашылі пакуль не чапаць партыі, а запалохаць само грамадзтва, каб пазбавіць апазыцыйных палітыкаў якой бы там ні было падтрымкі зьнізу”, — так ацэньвае падзеі вакол Саюзу пісьменьнікаў “Наша ніва” (25 лістапада 2005 г.). “Белгазета” настроеная больш пэсымістычна: “Праз год ФПБ, БРСМ і іншыя арганізацыі, якія знаходзяцца ў стане яднаньня з уладай, пераўтворацца ў адзіна дазволеную форму грамадзкай актыўнасьці” (26 верасьня 2005 г.).

## Нацыянальныя меншасьці і рэлігійныя суполкі пад асобым кантролем

Пасьля правядзеньня дэманстрацыйнай апэрацыі па захопе кіраўніцтва ў Саюзе палякаў на Беларусі, улады вырашылі запалохаць і прадстаўнікоў іншых нацыянальных меншасьцяў. Нагодай для гэтага стаў жнівеньскі сход шэрагу актывістаў нямецкай, польскай, украінскай, цыганскай і татарскай дыяспараў, а таксама каталіцкай моладзі і Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Яны падпісалі зварот на імя прэзыдэнта краіны А. Лукашэнкі з патрабаваньнем “спыніць антызаконныя

дзеяньні ў дачыненьні актывістаў і кіраўнікоў грамадзкага аб'яднаньня "Саюз палякаў на Беларусі" і распачаць дыялёг з удзелам законнага кіраўніцтва арганізацыі на чале са спн. Анжалікай Борыс". На сходзе таксама абмяркоўвалася ідэя стварэньня міжнацыянальнай і міжканфэсійнай ініцыятывы "Згода".

Сам факт такой акцыі салідарнасьці ня мог не насьцярожыць уладу. Напачатку кастрычніка, на даручэньне Камітэту ў справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў, гарадзкая пракуратура пачала праводзіць праверку. Удзельнікі сходу спачатку давалі тлумачэньні ў пракуратуры, а пасьля атрымалі афіцыйныя папярэджаньні. Ім закідалася выступленьне і ад імя зарэгістраваных грамадзкіх аб'яднаньняў нацыянальных меншасьцей (падкрэсьлівалася, што на гэта яны ня мелі права), і ад імя незарэгістраванай ініцыятывы "Згода", якая заснавана не была.

Відавочна, грамадзкія аб'яднаньні нацыянальных меншасьцяў і іх актывісты знаходзяцца сёньня на асобым кантролі. Любая несанкцыянаваная іх дзейнасьць выклікае імгненную рэакцыю з боку адпаведных установаў і органаў, якія яе адсочваюць. Прычым, захады дзяржаўных структураў адладжаныя, скаардынаваныя. Напрыклад, у выпадку са "Згодай" была арганізаваная сэрыя выступаў у дзяржаўных СМІ кіраўнікоў грамадзкіх і рэлігійных аб'яднаньняў нацыянальных меншасьцяў з асуджэньнем удзельнікаў жнівеньскай нарады. Да акцыі падключылася нават прэзыдэнцкая газэта "СБ", якая зьмясьціла "выкрывальніцкі" артыкул "Согласие" без согласия"(5 кастрычніка 2005 г.).

Пасьля згаданых падзеяў пад удар патрапіла і незарэгістраваная ў нашай краіне Беларуская праваслаўная аўтакефальная праваслаўная царква. 11 кастрычніка на калегіі Камітэту ў справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў яго старшыня С. Буко гаварыў пра дзейнасьць у Менску "незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыі, якая вызнае каштоўнасьці, здольныя ўнесьці раскол у беларускую праваслаўную царкву" (!). Разьбірацца з БАПЦ і іншымі падобнымі незарэгістраванымі рэлігійнымі структурамі павінны былі праваахоўныя органы (БЕЛТА, 11 кастрычніка 2005 г.).

Адсутнасьць юрыдычных адрасоў сталася падставай для ліквідацыі праз суд шэрагу рэлігійных аб'яднаньняў. У няпростай сытуацыі апынулася рэлігійная суполка Хрысьціянаў Поўнага Эвангельля "Царква Новае Жыцьцё" ў Менску. Яна не магла атрымаць ад уладаў узгадненьне на правядзеньне набажэнстваў у прыстасаваных памяшканьнях, таму вернікі былі вымушаны зьбірацца штонядзелю ў будынку былога кароўніка па вул. Кавалёва, які належыць суполцы на правах уласнасьці. Аднак правядзеньню набажэнстваў актыўна перашкаджала міліцыя, а суды накладалі на кіраўнікоў царквы мільённыя штрафы. Больш за тое, гарадзкія ўлады вырашылі пазбавіць суполку і гэтага будынку. Тады вернікі прынялі рашэньне пайсьці на прыём да мэра сталіцы, каб дамагчыся вырашэньня праблемы. Аднак улады, баючыся масавай акцыі (у суполцы каля 1000 чалавек, пераважна маладых людзей), падключылі высокіх міліцэйскіх чыноў, якія спачатку запалохвалі пастара Вячаслава Ганчарэнку, а пасьля прапанавалі арганізаваць перамовы. Аднак у чарговы раз падманулі, бо замест рэальных перамоваў з гарадзкімі ўладамі прапанавалі вернікам размову з другараднымі чыноўнікамі, якія нічога не вырашаюць. Неўзабаве суд Маскоўскага раёну Менску аштрафаваў адміністратара царквы Васіля Юрэвіча на суму больш як 4 мільёны рублёў за "паўторнае парушэньне парадку правядзеньня набажэнства". Але вернікі рашуча настроеныя на працяг барацьбы.

## Акцыі застрашваньня

Усе мерапрыемствы рэжыму, накіраваныя на абмежаваньне дзейнасьці незарэгістраваных грамадзкіх структураў і запалохваньне іх актывістаў, знайшлі сваё лягічнае завяршэньне ў прыняцьці папраўак у Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы. У сьнежні вельмі апэратыўна яны былі прынятыя Палатай прадстаўнікоў і ўхваленыя Саветам рэспублікі. Паводле згаданых папраўак, удзел у дзейнасьці грамадзкай альбо палітычнай арганізацыі, якая не прайшла рэгістрацыю альбо была яе пазбаўленая можа карацца штрафам, арыштам тэрмінам да шасьці месяцаў альбо пазбаўленьнем

Асамблея НДА

волі на тэрмін да двух гадоў. Падобныя і нават большыя тэрміны прадбачаныя і за іншую "неафіцыйную" дзейнасьць, за "дыскрэдытацыю" нашай краіны ды іншае.

*"Иногда лучше молчать, чем говорить"*, — так акрэсьліла новыя правіла існаваньня іншадумцаў у РБ прэзыдэнцкая газэта (3 сьнежня 2005 г.). Сыгнал для іх быў зроблены напярэдадні абвяшчэньня даты датэрміновага правядзеньня прэзыдэнцкіх выбараў. Гэтыя падзеі ў сукупнасьці плюс заява старшыні КДБ пра хуткія першыя "справы" павінны былі дэмаралізаваць і запалохаць актывістаў дэмакратычных структураў, прымусіць іх адмовіцца ад удзелу ў палітычнай і грамадзкай дзейнасьці. На-жаль, ні дэмакратычныя палітычныя партыі, ні грамадзкія арганізацыі ня здолелі апэратыўна адрэагаваць і прапанаваць актывістам плян дзеяньняў у новых умовах. А ў рэальную сілу заяваў міжнародных арганізацыяў і дзяржаўных установаў шэрагу краінаў з асуджэньнем паправак ня верацьня толькі чыноўнікі Лукашэнкі, але і дэмакраты. Канкрэтную параду беларускім дэмакратычным сілам даў вэтэран польскай "Салідарнасьці", дэпутат Эўрапейскага парлямэнту Богдан Кліх: Папраўкі ігнараваць! (Наша ніва, 16 сьнежня 2005 г.)

Нельга сказаць, што рэжым заўсёды дзейнічае просталінейна і робіць стаўку толькі на рэпрэсіі і запалохваньні. Апошнім часам у некаторых рэгіёнах краіны (Віцебшчына, Гарадзеншчына) былі адзначаныя выпадкі, калі прадстаўнікі мясцовых уладаў прапаноўвалі беспрацоўным актывістам палітычных і грамадзкіх арганізацыяў варыянты працаўладкаваньня. Па іх лёгіцы, гэтыя людзі ўжо ня будуць браць актыўнага ўдзелу ў апазыцыйных акцыях. Можна спрагназаваць, што ў будучым годзе падобная мэтодыка будзе ўжывацца больш шырока з мэтай аслабленьня нешматлікіх дэмакратычных асяродкаў у рэгіёнах.

Адначасова рэпрэсіўныя захады ўжываюцца ў дачыненьні да асобных актывістаў. У лістападзе зь Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўнівэрсытэту была адлічаная студэнтка-выдатніца Тацяна Хома. Уся яе віна заключалася ў тым, што яна самавольна езьдзіла ў Францыю, дзе была абраная ў кіраўніцтва ўплывовага эўрапейскага студэнцкага саюзу ESIB. Ёсьць падставы меркаваць, што сёлета пачаў рэалізоўвацца плян па выцясьненьні зь Беларусі на эміграцыю шэрагу грамадзкіх дзеячоў, дзейнасьць якіх раздражняе рэжым, прыносіць яму нямала клопатаў. З гэтай мэтай ладзяцца правакацыі: напады на людзей, іх сваякоў, на кватэры, офісы ды інш.

Сталым раздражняльнікам для рэжыму застаюцца сваякі зьніклых апазыцыйных палітыкаў. Сёлета пачаў ствараццa грамадзкі трыбунал па расьсьледаваньні абставінаў гібелі альбо зьнікненьняў гэтых людзей. З такой ініцыятывай выступіла Людміла Карпенка, удава памерлага ў 1999 г. пры нявысьветленых абставінах палітыка Генадзя Карпенкі.

Выключны выпадак здарыўся ў Жодзіна. Некалькі разоў на працягу кастрычніка зьдзяйсьняліся напады на кватэру кіраўніка мясцовых арганізацыяў Партыі БНФ і Таварыства беларускай мовы Аляксея Лапіцкага. Першая акцыя была праведзеная невядомымі 18 кастрычніка, калі фарбай былі залітыя вокны кватэры Лапіцкіх. У ноч на 24 кастрычніка ў вокны ўжо стралялі з пнэўматычнай зброі. У наступную ноч іх ізноў аблілі фарбай, а адна з шыбаў была разьбітая. Якраз напярэдадні А. Лапіцкі дамогся ад уладаў, каб яго сын атрымаў магчымасьць вучыцца ў школе на роднай мове.

У тым жа кастрычніку берасьцейскія міліцыянты зьдзейсьнілі напад на памяшканьне, у якім месьціцца мясцовая арганізацыя Фонд падтрымкі моладзевых ініцыятываў "Дзедзіч", былі забраныя друкаваныя выданьні. У пачатку сьнежня грамадзкі дзяяч Зьміцер Шыманскі дамогся вынясеньня пракуратурай афіцыйнага папярэджаньня ў адносінах да аднаго з супрацоўнікаў Маскоўскага РАУС Берасьця, які ўдзельнічаў у аглядзе памяшканьня (ён праводзіўся з парушэньнямі). У лістападзе міліцыянты правялі ператрус у кватэры моладзевага актывіста з Сьветлагорску Вадзіма Богдана, канфіскавалі друкаваныя выданьні, а пасьля ён быў аштрафаваны.

Варта таксама згадаць і пра беспрэцыдэнтны выпадак, які адбыўся 14 верасьня ў Магілёве. Падчас пахаваньня кіраўніка мясцовай арганізацыі апазыцыйнай Партыі камуністаў беларускай Ул. Падаля-

на праваахоўнымі органамі былі затрыманыя некалькі актывістаў палітычных і грамадзкіх арганізацыяў. Мэтай затрыманьня было недапушчэньне іх выступу на грамадзянскай паніхідзе.

У лістападзе прэзыдыюм Менскага гарадзкога суду адмяніў рашэньне суду Першамайскага раёну ад 14 лютага б.г., паводле якога БТ мусіла абвергнуць непраўдзівую інфармацыю пра грамадзкага актывіста са Слоніма Міхася Варанца, распаўсюджаную ў праграме “Панарама”. Пасьля таго, як Вярхоўны суд вынес пратэст, было вырашана, што журналіст БТ у тэлесюжэце выказаў уласнае меркаваньне. Такім чынам улада пацьвердзіла, што ранейшая перамога Варанца была пралікам, які “незалежныя” суды Беларусі больш не дапусьцяць.

У пачатку сьнежня ў Курапатах зноў адбыўся акт вандалізму. Але такога яшчэ ніхто ня бачыў: побач са зламанымі крыжамі і распісанымі сьценамі падземнага пераходу — намаляваная свастыка на абразе Маці Божай Курапацкай. На гэтае здарэньне нават адгукнуліся некаторыя дзяржаўныя СМІ, чаго раней у падобных выпадках не заўважалася.

## Грамадзкая дзейнасьць не замірае

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, якія пакуль маюць тэндэнцыю зьмены толькі ў бок пагаршэньня, грамадзкія аб’яднаньні адзначыліся разнастайнай дзейнасьцю. Прычым, у некаторых выпадках ім па-ранейшаму ўдаецца праводзіць мерапрыемствы сумесна зь мясцовымі ўладамі альбо дзяржаўнымі арганізацыямі. Напрыклад, у кастрычніку грамадзкія актывісты са Сьветлагорску атрымалі падзяку ад дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі” за актыўны ўдзел у 15-дзённай экспэдыцыі, якая праводзілася на археалягічных раскопках у Жлобінскім раёне. Але гэта хутчэй выключэньне, чым правіла.

Таксама не перарываюцца, а яшчэ больш умацоўваюцца міжнародныя кантакты беларускіх НДА. У кастрычніку беларускія настаўнікі, прадстаўнікі НДА Гарадзеншчыны, сумесна з польскімі і літоўскімі калегамі заснавалі ў г. Сэйны (Польшча) “Таварыства настаўнікаў Памежжа”. Новая арганізацыя мае на мэце спрыяньне ўзаемным кантактам настаўнікаў трох краінаў, павышэньне іх прафэсійнага росту і абмену досьведам. Умацоўваюцца кантакты грамадзкіх аб’яднаньняў памежных тэрыторыяў Беларусі і Ўкраіны, рэалізуюцца сумесныя праекты, заключаюцца дамовы аб супрацоўніцтве.

НДА зангажаваныя і ў правядзеньне шэрагу кампаніяў. 22 кастрычніка ў Менску падчас канфэрэнцыі “Новае заканадаўства пра няўрадавыя арганізацыі: досьвед уплыву на прыняцьцё палітычных рашэньняў у Беларусі” былі падведзеныя вынікі чарговага этапу кампаніі “Наша Салідарнасьць”, якая доўжыцца з 2003 г. На Берасьцейшчыне стартавала грамадзкая інфармацыйная кампанія “Псэўда-экалягічны турызм і адукацыя ў Белавескай пушчы: а што ты думаеш пра гэта?”. З ініцыятывай яе правядзеньня выступіў экалягічны партал “Белавеская пушча-XXI стагодзьдзе”. Яго стваральнікі і сябры лічаць, што сёньня неабходны ўдзел грамадзкасьці ў прыняцьці важных рашэньняў. На іх думку, трэба ператварыць Нацыянальны парк “Белавеская пушча” у “парк для нацыі, замест парку для адміністрацыі”. Грамадзкія актывісты прынялі актыўны ўдзел у дапамозе з распаўсюдам незалежных выданьняў, якія сёлетняй восеньню апынуліся пад шалёным ціскам рэжыму.

Восеньню ў розных рэгіёнах краіны адбыліся прэзэнтацыі вынікаў маштабнага сацыялягічнага дасьледаваньня для прадстаўнікоў недзяржаўных арганізацыяў. Асноўнай высновай прэзэнтаванага дасьледавання, якое рабілася навуковымі цэнтрамі зь Беларусі, Літвы і Славаччыны, сталася тое, што галоўную ўвагу дэмакратычныя сілы павінны надаць мабілізацыі, актывізацыі і арганізацыі пратэстных групаў грамадзтва на адстойваньне сваіх выбарчых правоў.

Пасьпяховай акцыяй нацыянальнага маштабу, у якой прымаюць актыўны ўдзел грамадзкія актывісты, стаўся Дзень беларускай салідарнасьці. З кастрычніка ён праводзіцца штомесяц 16 чысла. А 20-

й гадзіне тысячы людзей па ўсёй краіне выключаюць сьвято ў сваіх кватэрах і ставяць на падваконьне сьвечкі ў памяць аб ахвярах рэжыму. Дзень беларускай салідарнасьці праводзіцца і на вуліцах. Падчас апошняй такой акцыі ў Сьветлагорску 16 сьнежня пяць чалавек былі затрыманыя міліцыяй.

Шэраг НДА актыўна ўдзельнічае ў справе ўшанаваньня памяці нашых землякоў-удзельнікаў вызвольных паўстаньняў. Некаторыя акцыі сталіся ўжо традыцыйнымі, як, напрыклад, ўшанаваньне ў Сьвіслацкім раёне памяці Віктара Каліноўскага, ідэоляга і аднаго з арганізатараў вызвольнага паўстаньня 1863 году. Сёлета ў кастрычніку ў ёй узялі ўдзел каля сотні чалавек, якія прыехалі з розных рэгіёнаў краіны. Акцыя адсочвалася міліцыянтамі, якія затрымалі аўтамабіль, у якім ехала берасьцейская дэлегацыя. Вядомая грамадзкая актывістка Ірына Лаўроўская была дастаўленая ў Сьвіслацкі РАУС, дзе на яе склалі пратакол “за выкарыстаньне незарэгістраванай сымболікі”. У Берасьцейскай вобласьці, дзякуючы намаганьням Берасьцейскай гарадзкой габрэйскай арганізацыі “Брыск” і навукова-асьветніцкага цэнтру “Галакост” праводзяцца акцыі памяці ахвяраў нацысцкага тэрору ў гады вайны.

Традыцыйным стаў удзел НДА шэрагу рэгіёнаў ва ўшанаваньні памяці паэтаў і пісьменьнікаў. У кастрычніку лідзкая гарадзкая арганізацыя ТБМ супольна з аддзелам культуры райвыканкаму і літаратурным аб’яднаньнем “Суквецьце” правяла вечарыну памяці паэта-земляка Віктара Бачарова, які заўчасна памёр у мінулым годзе. Высілкамі Бялыніцкага ГА “Краязнаўчае таварыства” разам з адміністрацыяй ПМК-241 была праведзеная вечарына, прысьвечаная памяці паэта Віктара Хаўратовіча, першага старшыні Бялыніцкай арганізацыі ТБМ. У лістападзе прадстаўнікі Берасьцейскай філіі Саюзу беларускіх пісьменнікаў стварылі адмысловы аргкамітэт, які будзе займацца ўшанаваньнем памяці жабінкаўскіх паэтаў Васіля Гадулькі і Васіля Сахарчука. Дзякуючы намаганьням навукова-культурніцкай грамадзкасьці Магілёва, 11 лістапада ў абласным цэнтры адкрылася мэмарыяльная дошка памяці навукоўца і патрыёта Еўдакіма Раманава.

Па-ранейшаму зьяўляецца нямала ініцыятываў, у тым ліку і выдавецкіх. Сярод апошніх навінак варта адзначыць зьяўленьне друкаванай вэрсіі часопіса “Праўнік”, выданьне Цэнтрам этнакасмалёгіі “Крыўя” альманаху “Druvis”. Грамадзкімі актывістамі выдаюцца таксама і кнігі. Па ініцыятыве магілёўскага грамадзкага аб’яднаньня “Лекарскі зьвяз” восеньню пабачыла сьвет выданьне пад назвай “Мэдычныя і экалягічныя наступствы катастрофы на Чарнобыльскай АЭС”.

Грамадзкімі аб’яднаньнямі рэалізуецца нямала сацыяльных праектаў. Варта адзначыць ініцыятыву гарадзенскай філіі ГА “Маладыя сацыял-дэмакраты — Маладая Грамада”, якая распачала рэгулярныя дэманстрацыі сацыяльных фільмаў для моладзі.

Немалыя высілкі НДА скіраваныя менавіта на працу з моладзьдзю. Восеньню ў межах адкрытага асьветніцкага праекту “EuroUniver” (Эўрапейскі народны ўнівэрсытэт у Віцебску) запрацаваў навучальны інтэрнэт-партал. У Горадні ужо дзевяць гадоў ГА “Цэнтар “Трэці сэктар” ажыцьцяўляецца праект “Школа маладога журналіста”. Сябры моладзевай суполкі Таварыства беларускай мовы ў Сьветлагорску, якія сёлета сталі студэнтамі сталічных ВНУ, не адыйшлі ад грамадзкай дзейнасьці, а стварылі ў Менску сваю першасную арганізацыю ТБМ.

## Высновы

Пасьля аналізу дзейнасьці НДА Беларусі за пэрыяд зь верасьня па сьнежань 2005 г. можна зрабіць наступныя высновы:

1. Сёньня ўлада ставіць перад сабой, як кароткачасовыя, так і далёкасяжныя мэты. Сярод першых — “зачыстка” трэцяга сэктару напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў. Апошнія прадугледжваюць жыцьцё па новых правілах у пасьлявыбарчы пэрыяд.

2. Улада не зацікаўленая ў легалізацыі “ценявога” трэцяга сэктару. Для яе выгодная яго поўная ліквідавацыя.

3. Пад найбольшай пагрозай знаходзяцца незалежныя зарэгістраваныя і незарэгістраваныя грамадзкія аб’яднаньні, якія маюць разгалінаваныя структуры. Можна чакаць рэпрэсіўных захадаў менавіта ў дачыненьні “сетак”, якія ўлады лічаць небясьпечнымі для сябе.

4. Чакаецца значнае зьніжэньне грамадзкай актыўнасьці, як легальнай так і неафіцыйнай, у сувязі са зьменамі ў заканадаўстве аб НДА і папраўкамі ў Крымінальны кодэкс.

5. Улада рыхтуе своеасаблівага “траянскага каня” — фальшывы трэці сэктар, цалкам падкантрольны дзяржаве, перад якім будзе пастаўленая задача па замене зьнішчаных незалежных структураў. Ён будзе прапанаваны для кантактаў міжнародным структурам і, зразумела, ня будзе ў сваёй дзейнасьці дапускаць “дыскрыдытацыі Рэспублікі Беларусь”.

6. Незалежны трэці сэктар можа захавацца толькі пры кансалідаванай і салідарнай дзейнасьці, ужыцьці новых мэтадаў працы ва ўмовах лукашэнкаўскага рэжыму. У гэтым вялікае значэньне мае дзейсная і актыўная падтрымка незалежнага трэцяга сэктару Беларусі з боку міжнародных структураў.